# ПРАЦЭС ФАРМІРАВАННЯ АБНАЎЛЕНЧЫХ СТРУКТУР НА ТЭРЫТОРЫІ МАГІЛЁЎСКАЙ ЕПАРХІІ Ў МАІ–ВЕРАСНІ 1922 г.

**Бараненка Віктар Віктаравіч**
аспірант кафедры гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы; магістр гістарычных навук (г. Мінск, Беларусь)

У першай палове 1922 г., як следства палітыкі атэістычнай дзяржавы па ажыццяўленню плану па расколу Рускай праваслаўнай царквы, да царкоўнай улады прыходзяць абнаўленцы, якія разлічвалі правесці радыкальнае абнаўленне царкоўнага жыцця на прынцыпах характэрных для першых вякоў хрысціянства [1, с. 16–17]. Сярод асноўных задач, якія ставілі перад сабой абнаўленцы было дасягненне прымірэння царквы з бальшавіцкім рэжымам [2, с. 20]. Атрымаўшы доступ да царкоўнай улады, абнаўленчыя лідары звярнуліся з пасланнем ва ўсе епархіі, а таксама праз прадстаўлены ім уладамі савецкі друк, да кліру і міран з заклікам неадкладна парваць з "ціханаўшчынай" і перайсці ў "Жывую Царкву"[1] [3, с. 2]. Духавенству строга прадпісвалася не толькі ствараць "жывацаркоўныя" прыходы, благачынні і епархіі, але і тэрмінова правесці ў іх кіруючыя органы на надзвычайных з'ездах і сходах "преданных революционному делу и Советской власти" клірыкаў [4, с. 20].

Аўтарытэтныя і ўплывовыя іерархі, якія замінаді поўнага пераходу ўлады да абнаўленцаў, адхіляліся новым ВЦУ ад кіравання або арыштоўваліся карнымі органамі дзяржавы [5, с. 481]. Падобны лёс напаткаў і кіруючага архірэя Магілёўскай епархіі Канстанціна (Булычова). У маі 1922 г. Магілёўскі архіепіскап быў абвінавачаны ў супрацьдзеянні кампаніі па канфіскацыі царкоўных каштоўнасцяў і быў асуджаны [6, с. 104]. Пасля арышту архіепіскапа Канстанціна (Булычова) кіраванне Магілёўскай епархіі адышло да вікарыя Гомельскага Варлаама (Рашанцава), які падтрымаў новую царкоўную ўладу. Адным з першых святароў Гомельскай губерніі, а таксама Магілёўскай епархіі, абнаўленства падтрымаў настаяцель Праскурыянскай царквы Рагачоўскага павета [7, с. 1]. Ён у маі 1922 г. у газеце "Полесская Правда" выступіў у падтрымку "прагрэсіўнага" духавенства Петраграда і Саратава [8, с. 1].

[1] Абнаўленчая групоўка, у склад якой да жніўня 1922 г. уваходзілі ўсе прыхільнікі абнаўленства.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

У чэрвені 1922 г. кіруючым Магілёўскай епархіяй епіскапам Варлаамам (Рашанцавым) была атрымана з Масквы тэлеграма ад Арганізацыйнага Камітэта "Жывой Царквы" з запрашэннем адкрыць у Магілёве мясцовую групу "Жывой Царквы", а таксама абраць дэлегатаў на Усерасійскі з'езд прадстаўнікоў "Жывой Царквы" у Маскве [9, л. 92]. Згодна дадзенаму загаду, магілёўская група "Жывой Царквы" была створана 27 ліпеня 1922 г. на арганізацыйным сходзе. На гэтым жа сходзе была абрана дэлегацыя на маскоўскі з'езд "Жывой Царквы" у складзе протаіерэя Міхаіла Плешчынскага, протаіерэя А. Зыкава, Сяргея Іванцова і міраніна Аксюціча [9, л. 92]. Усяго на сходзе прысутнічала 37 чалавек [10, л. 195].

Праз месяц пасля стварэння магілёўскай групы "Жывой Царквы", 25 жніўня 1922 г. было створана абнаўленчае Магілёўскае епархіяльнае ўпраўленне ў складзе ўпаўнаважанага протаіерэя М. Плешчынскага, протаіерэя Я. Вішнеўскага, протаіерэя М. Зефірава, С. Іванцова, А.У. Трусевіча і сакратара Мітрафана Чэскага пад кіраўніцтвам епіскапа Варлаама (Рашанцава) [9, л. 92; 11, л. 100–100 об.].

27 жніўня 1922 г. у Магілёве адбыўся агульны сход групы "Жывой Царквы". На сходзе прысутнічала каля 1000 чалавек. Па ходзе сходу высветлілася, што гэта быў не сход "Жывой царквы", а барацьба прыхільнікаў архіепіскапа Канстанціна (Булычова) і епіскапа Варлаама (Рашанцава). Сход падзяліўся на дзве часткі, адна з якіх выступіла супраць прызыву да дзейнасці ў "Жывой Царкве" архіепіскапа Канстанціна (Булычова), называючы яго кансерватарам і непажаданым ва ўпраўленні царквы, заяўляючы сваё жаданне бачыць епіскапам Варлаама (Рашанцава). Іншая частка называла сябе "Саборнай партыяй" і выступала за архіепіскапа Канстанціна (Булычова). Апошнюю частку падтрымлівала і духавенства. У абарону Канстанціна (Булычова) выступіў і Варлаам (Рашанцаў). Яму доўга не давалі гаварыць, але супакоіўшы абодва бакі, сказаў, што ён сам з асаблівым задавальненнем прыме прапанову аб вызваленні архіепіскапа Канстанціна (Булычова) са зняволення, з якім у яго, праўда, былі некаторыя непаразуменні, але яны вядома з'явіліся не ад злой волі іх абодвух. Епіскап Варлаам (Рашанцаў) назваў Канстанціна (Булычова) добрым і, нават, прагрэсіўным. Ён таксама прасіў сход падпісаць рэзалюцыю для вызвалення архіепіскапа. Такая рэзалюцыя была складзена на трох аркушах, пад ёй і распісаліся ўсе "канстанцінаўцы" [11, л. 100–100об.]. Згодна архіўным звесткам, да групы "варлаамаўцаў" належаў амаль увесь просты люд, да групы ж Канстанціна (Булычова) належала частка духавенства і мясцовая інтэлігенцыя [11, л. 100–100об.].

Пасля маскоўскага з'езду "Жывой Царквы" у жніўні 1922 г. Магілёўскае епархіяльнае ўпраўленне разаслала ўсім благачынным цыркуляры (ад 3 верасня за № 18) з прапановай неадкладна склікаць акруговыя з'езды духавенства і высветліць пытанне аб іх адносінах да далучэння да "Жывой Царквы", прычым з прыпіскаю, што нязгодныя рызыкавалі стратай прыхода [12, л. 139]. Пагроза наводзіла на разважанні і насцярожвала духавенства, тым не менш распараджэнне Магілёўскага епархіяльнага ўпраўлення было прынята да выканання, хоць не ўсюды спачувальна і з даверам [9, л. 92].



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

У асноўным, прадстаўнікі духавенства Магілёўскай епархіі адказвалі маўчаннем на ўсе запрашэнні ўвайсці ў склад “Жывой Царквы”, а іншыя, ад запісу ўхіляліся, лічачы ўсялякія групоўкі і навіны шкоднымі для адзінства Царквы. У сваю чаргу веруючыя баяліся блюзнерства і не ішлі за “Жывой Царквой” [9, л. 92; 13, л. 95].

Такім чынам, бачна што да верасня 1922 г. абнаўленчы рух, як сярод духавенства, так і ў асяроддзі веруючага насельніцтва, быў слаба распаўсюджаны на тэрыторыі Магілёўскай епархіі. У адзначаны перыяд малалікія прыхільнікі абнаўленства займаліся стварэннем абнаўленчых епархіяльных структур кіравання. Пэўную дапамогу абнаўленцам у гэтай справе аказалі органы ДПУ, пры дапамозе якіх быў арыштаваны кіруючы архірэй Канстанцін (Булычоў), а на яго месца быў прызначаны лаяльны ў адносінах да новай царкоўнай улады Варлаам (Рашанцаў). З моманту стварэння і пачатку функцыянавання Магілёўскага епархіяльнага ўпраўлення з боку новай царкоўнай улады пачынаюцца спробы па прыцягненню прыхадскога духавенства да абнаўленства.

**Літаратура**

1. Белков, Е. Сущность «Живой Церкви» (К диспуту в Московской консерватории) / Евг. Б-в // Живая Церковь. – 1922. – № 4–5. – С. 16–17.
2. Бонч-Бруевич, В. «Живая Церковь» и пролетариат / Владимир Бонч-Бруевич. – М. : Комис. по улучшению жизни детей при ВЦИК. «Жизнь и знание». – 63 с.
3. Верующим сынам Православной Церкви России // Известия ВЦИК. – 1922. – 14 мая. – С. 2.
4. Шкаровский, М. В. Обновленческое движение в Русской Православной Церкви XX века / М. В. Шкаровский. – СПб. : Нестор, 1999. – 100 с.
5. «Совершенно секретно»: Лубянка – Сталину о положении в стране (1922–1934 гг.): в 10-ти т. / ред.кол.: Ю. Л. Дьяков (отв. ред.) [и др.]. – М., 2001. – Т. 1 : Ч. 1 : 1922 г. – 490 с.
6. Отчет Гомельского губернского исполнительного комитета, декабрь 1921 г. – ноябрь 1922 г. – Гомель, 1922. – 417 с.
7. Революция церковных низов // Полесская Правда. – 1922. – 23 мая. – С. 1.
8. Козловский, Г. Требуйте отлучение от церкви лже-пастырев. Обращение священника Рогачевского уезда / Георгий Козловский // Полесская Правда. – 1922. – 23 мая. – С. 1.
9. Двухнедельная информационная сводка Могилевского уездного государственного политического управления за время с 21 по 28 сентября 1922 г. // ГАООМог. – Фонд 6622. – Оп. 1. Д. 119. Л. 91–92.
10. Меморандум о собрании группы прогрессивного духовенства «Живая Церковь» // ГАООМог. – Фонд. 6622. Оп. 1. Д. 119. – Л. 195.
11. Меморандум о группе «Живая Церковь» // ГАООМог. – Фонд 6622. Оп. 1. Д. 119. Л. 100-100об.
12. Циркуляр Могилёвского епархиального управления о.о. Благочинным и духовенству Могилёвской епархии от 3 сентября 1922 г. // ГАООМог. – Фонд. 6622. – Оп. 1. – Д. 119. – Л. 138-139.
13. Месячная информационная сводка Могилевского уездного государственного политического управления за время с 1 сентября по 1 октября 1922 года // ГАООМог. – Фонд 6622. Оп. 1. Д. 119. Л. 94–95об.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова